УДК 304.42:130.2(476):17.02336

***В.А. Адзіночанка***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. філасофіі*
*Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны*
e-mail: adzin28@gmail.com

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРАЛОГІЯ: ПРАБЛЕМА ПАБУДОВЫ ТЭОРЫІ

*Разгледжаны канцэптуальныя схемы, з якіх зыходзяць беларускія даследчыкі культуры, падкрэсліваецца неабходнасць асэнсавання гэтых схем і абмеркавання перспектыў іх развіцця. Адзначаецца, што ў культуралогіі ўжываецца мноства тэарэтычных падыходаў, кожны з якіх раскрывае адзін з аспектаў культуры. У сучаснай беларускай культуралогіі важна выходзіць з характару тых працэсаў, якія ў дадзены момант адбываюцца ў краіне. Неабходны пераход ад назапашвання эмпірычнага матэрыялу па гісторыі і сучасным стане беларускай культуры да яго тэарэтычнага асэнсавання. Культуралагічныя даследаванні ва ўмовах сучаснай Беларусі маюць практычны характар. Праз іх асэнсоўваецца спецыфіка нашай культуры і вызначаюцца накірункі яе развіцця.*

## Уводзіны

Мэтай артыкула з'яўляецца аналіз сацыяльных і эпістэмалагічных перадумоў пабудовы тэорыі ў сучаснай беларускай культуралогіі. Будуць разгледжаны канцэптуальныя схемы, з якіх зыходзяць беларускія даследчыкі культуры. Дадзены артыкул з'яўляецца найперш спробай абмеркаваць праблему пабудовы тэорыі ў сучаснай беларускай культуралогіі, а не прапанаваць спосабы яе вырашэння. Апошняе будзе паступова ажыццяўляцца ў ходзе развіцця культуралагічных даследаванняў і дыскусій паміж даследчыкамі.

Падкрэслім, што мы не імкнёмся да паўнаты разгляду стану культуралагічных ведаў у сучаснай Беларусі. Гэта зроблена ў працах прафесара А.І. Смоліка [1; 2], якія з'яўляюцца падмуркам для далейшых даследаванняў.

## Праблема актуальнасці культуралогіі

Мы можам з упэўненасцю гаварыць аб практычнай значнасці культуралагічных даследаванняў у сучаснай Беларусі. Прынамсі, на падставе разумення культуры вызначаюцца шляхі яе развіцця і ажыццяўляецца культурная палітыка дзяржавы. Практычнае значэнне тэарэтычных палажэнняў сучаснай беларускай культуралогіі абумоўлена перш за ўсё характарам трансфармацыі ў нашай краіне.

Сучаснасць – ключавое паняцце для вызначэння спецыфікі тых працэсаў, якія цяпер адбываюцца ў беларускім грамадстве. У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» сучаснасць вызначаецца як ‘уласцівасць сучаснага (у 3 знач.). 1. Які мае адносіны да цяперашняга часу, да сваёй эпохі. 2. Які знаходзіцца на ўзроўні свайго веку, адпавядае патрабаванням свайго часу. 3. Які адбываецца цяпер, у дадзены час, цяперашні’ [2, с. 401].

У адпаведнасці з тэмай нашых разважанняў важна ўлічваць два значэнні паняцця «сучаснасць»: гэта тое, што адбываецца менавіта зараз (мы б яшчэ дадалі «і тут»), і тое, што адпавядае наяўным праблемам. Такім чынам, мы імкнёмся падкрэсліць актуальнасць тых праблем, якія стаяць перад сучаснай беларускай культуралогіяй.

Для нас паняцце *сучаснасць* мае вельмі канкрэтны сэнс. Сучасная Беларусь бярэ свой пачатак з падзей 1991 г., калі Вярхоўным Саветам БССР была абвешчана дзяржаўная незалежнасць Беларусі. Пачынаюцца працэсы, якія і ўтвараюць спецыфіку нашай сучаснасці. Яна вызначаецца перш за ўсё фарміраваннем незалежнай краіны са сваёй уласнай эканомікай, палітыкай, культурай і г.д. Такім чынам, пачатак усеаб-

дымнай трансфармацыі нашага грамадства паклалі нядаўнія палітычныя падзеі, але трэба памятаць, што яны самі – вынік папярэдніх гістарычных працэсаў станаўлення беларускай нацыі. Узнікненне беларускай дзяржавы з'явілася моцным імпульсам для фарміравання сучаснай беларускай культуры: «Самаарганізаваўшыся ў цывілізаванае грамадства і дзяржаву, народ стварае сваю сістэму культуры, праз якую далучаецца да культуры сусветнай» [3, с. 705].

Цяпер перад беларускім грамадствам востра стаіць праблема культурнага самаасэнсавання. Трэба ўлічваць, што яна мае сваю традыцыю і неапрацаваныя схемы разважанняў. Сучасныя даследчыкі абапіраюцца шмат у чым на працы дзеячаў беларускай культуры пачатку ХХ ст. Знамянальнай для нас з'яўляецца назва артыкула М. Багдановіча «Хто мы такія?» і тыя палажэнні, якія ў ім змешчаны. Багдановіч пісаў: «Хто вы такія? Што вы за народ? Так пытаюцца ў нас, простых людзей. Але мы і самі не ведаем. Вакол усе кажуць: я – паляк, я – ліцвін, я – жыд. А мы нават імя свайго народа забыліся… Мы – трэці народ рускага кораню, завёмся беларусамі, і старонка наша завецца Беларусь. Ёсць паміж нас праваслаўныя, ёсць і каталікі, але народ з нас адзін, бо ўва ўсіх адна гаворка, адны звычаі, адны песні, адна вопратка, адзін лад жыцця» [4, с. 126].

Пытанне, якое паставіў Багдановіч, актуальнае і сёння, але на яго павінен быць дадзены адказ у адпаведнасці з сучаснымі задачамі. Ва ўмовах небяспекі культурнай асіміляцыі, якая існавала ў пачатку ХХ ст., Багдановіч падкрэсліваў наша адрозненне ад палякаў і рускіх. Цяпер, калі ўзнікла самастойная беларуская дзяржава, стаіць задача выяўлення спецыфічнага зместу нашай культуры. Яна не зводзіцца толькі да выяўлення культурнай спецыфікі, хаця ў галіне мастацтва праблема стаіць менавіта такім чынам. Як адзначыў кінарэжысёр заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В.А. Нікіфараў, «мы цікавыя толькі самабытнасцю» [5, с. 117]. Але ва ўмовах глабалізацыі і непазбежнай уніфікацыі культура – гэта тое, што адрознівае адну краіну ад другой і фарміруе нацыянальную свядомасць. Бо ўзмацненне падабенства еўрапейскіх краін у эканоміцы і палітыцы з'яўляецца відавочным. Перад Беларуссю стаіць задача ўключэння ў сусветныя эканамічныя працэсы. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, у перспектыве ў Беларусі будзе сфарміравана дэмакратыя еўрапейскага тыпу. У той жа час па меры развіцця беларускай дзяржавы ўсё больш праяўляецца спецыфіка нашай культуры і відавочным робіцца яе адрозненне нават ад культур блізкіх нам усходнеславянскіх народаў. Паказальна, што гэтыя працэсы асэнсоўваюцца ў сучаснай беларускай культуралогіі як адпаведныя сусветным тэндэнцыям: «Культурныя адрозненні, якія абумоўлены ўнікальнасцю гістарычнага шляху і самабытнасці таго ці іншага народа, забяспечваюць унёсак нацыі ў скарбніцу сусветнай культуры і разам з тым месца краіны ў сучасным свеце» [6, с. 493].

**Праблема прадмета і метадалогіі**

У справе вывучэння культуры сучаснымі беларускімі даследчыкамі зроблена вельмі значная праца. Выйшаў шэраг выданняў абагульняльнага характару, найбольш значнымі з якіх з'яўляюцца пяцітомная энцыклапедыя «Культура Беларусі» (2010–2014) і чатырохтомныя «Нарысы гісторыі культуры Беларусі» (на гэты момант выдадзены тры тамы). Апублікаваны таксама іншыя працы, у якіх дадзена ўсебаковае і падрабязнае апісанне народнай творчасці, міфалогіі, фальклору, побыту і г.д. Назапашаны вялікі фактычны матэрыял па гісторыі і сучасным стане беларускай культуры.

На дадзеным этапе актуальнай для беларускай культуралогіі робіцца задача пераходу «ад разрозненых апісанняў і дэкларацый да сінтэтычнага, у першую чаргу – навуковага пазнання культуры, але дзеля гэтага трэба больш дакладна адмежаваць навуковае пазнанне ад філасофскага і гуманітарнага, арыентаваць айчынную навуку аб культуры на заходнія ўзоры» [ 7, с. 88]. Для вырашэння гэтай задачы, на наш погляд, трэба звярнуцца перш за ўсё да метадалогіі навуковага пазнання, у галіне якой у Беларусі

шмат зроблена. У 70–80-х гг. мінулага стагоддзя працавала сусветна вядомая мінская метадалагічная школа на чале з прафесарам В.С. Сцёпіным (цяпер акадэмік РАН). Яе напрацоўкі могуць быць выкарыстаны пры разважаннях аб праблеме пабудовы тэорыі ў сучаснай беларускай культуралогіі.

Мы ўлічваем, што пытанне аб суаднясенні філасофскіх і навуковых ведаў з'яўляецца надзвычай складаным. Для тэмы нашых разважанняў дастаткова адзначыць, што ў аснове філасофіі і навукі ляжаць прынцыпова розныя пазнавальныя ўстаноўкі. Філасофія сфарміравалася як імкненне да мудрасці, яна даследуе агульныя прынцыпы пабудовы рэчаіснасці як такой. У ёй можа рабіцца націск на розных аспектах рэчаіснасці і могуць прапанавацца розныя яе трактоўкі, але яна заўсёды імкнецца да цэласнасці бачання. Культуралогія як навуковая дысцыпліна мае канкрэтны прадмет, які імкнецца даследаваць. Яна карыстаецца для гэтага навуковай метадалогіяй, хаця гэтыя метады могуць быць распрацаваны ў межах філасофскіх накірункаў, напрыклад неакантыянства, фенаменалогіі, герменеўтыкі, структуралізму, постмадэрнізму і г.д. Неабходнасць адмежавання культуралогіі ад гуманітарнага пазнання ў яго шырокім сэнсе з'яўляецца часткай агульнай праблемы розніцы паміж навуковымі і ненавуковымі ведамі, бо «гуманітарныя веды трактуюцца надзвычай шырока: у іх уключаюць філасофскія эсэ, публіцыстыку, мастацкую крытыку, мастацкую літаратуру і г.д.» [8, с. 101].

Адзначым, што мастацтва таксама з'яўляецца адным са спосабаў пазнання чалавечай рэчаіснасці. Культура можа быць глыбока асэнсавана ў вобразнай форме. Найбольш яскравым прыкладам гэтага для нас з'яўляюцца артыкулы Багдановіча, Купалы, Коласа, Абдзіраловіча, Быкава, Гілевіча. Але культуралогія, калі яна хоча быць навукай, павінна карыстацца навуковай метадалогіяй. Праблема заключаецца ў тым, што культуралогія – маладая навука са шмат у чым нявызначаным статусам, яна «яшчэ знаходзіцца ў стадыі станаўлення, удакладнення свайго зместу і метадаў, яе абрысы як навуковай дысцыпліны не набылі завершанага тэарэтычнага зместу» [9, с. 10].

Мы зыходзім з прынятай большасцю беларускіх даследчыкаў трактоўкі культуралогіі як самастойнай навукі. Яе можна разглядаць як агульную тэорыю культуры, якая абапіраецца ў сваіх палажэннях на аналіз канкрэтных з'яў. «Культуралогія (ад лац. *cultura* і грэч. *logos* – навука) – галіна сацыягуманітарных ведаў; навуковая дысцыпліна пра сутнасць і тыпы культуры, яе сацыяльныя функцыі, заканамернасці і дынаміку гістарычнага развіцця» [10, с. 183].

Пытанне аб статусе культуралогіі застаецца, і, на наш погляд, прадуктыўным з'яўляецца яго далейшае абмеркаванне. Тым не менш расце значнасць яе як асобнай навукі і вучэбнай дысцыпліны. «Беларуская культуралогія як навука аб культуры ў першым дзесяцігоддзі XXI ст. дасягнула сталага ўзроўню развіцця і ўжо набыла пэўную сістэмнасць, якая дазваляе прэтэндаваць на асэнсаванне шэрагу праблем, якія ў сумежных навуках да гэтага часу не атрымалі глыбокага асвятлення» [11, с. 18]. Ажыццявіць гэтыя прэтэнзіі культуралогія зможа толькі тады, калі яна прапануе свой уласны погляд на рэчаіснасць, а для гэтага ёй трэба выйсці на тэарэтычны ўзровень. Адзначым, што паняцце «тэорыя» ў перакладзе з грэчаскай мовы значыць «відовішча, інсцэніроўка» і вызначаецца як «вышэйшая, самая развітая форма арганізацыі навуковых ведаў, якая дае цэласнае ўяўленне пра заканамернасці і сутнасныя сувязі вызначанай галіны рэчаіснасці – аб'екта дадзенай тэорыі» [12, с. 45].

Зыходзячы з агульнага азначэння тэорыі, трэба ўлічваць, што ў розных навуках яна мае розны выгляд і па-рознаму ўзаемадзейнічае з эмпірычным узроўнем. Мы схіляемся да таго, што вызначальным элементам культуралагічнай тэорыі з'яўляецца канцэптуальная схема – сістэма паняццяў (лац. conceptus), праз якую задаецца пэўны спосаб бачання і разумення рэчаіснасці. Канцэптуальная схема з'яўляецца базавым элемен-

там тэорыі, праз яе фарміруецца анталагічная база тэорыі («схема рэчаіснасці») і спосабы яго даследавання («схема метаду»).

Асаблівасцю культуралагічных ведаў з'яўляецца поліпарадыгмальнасць і адпаведна магчымасці многіх інтэрпрэтацый. Але кожная з апошніх павінна паддавацца рацыянальнаму разуменню і валодаць сваёй канцэптуальнай схемай. Як прыклад розных магчымых падыходаў у культуралогіі можна прывесці метадалогію, прапанаваную прафесарам М.І. Крукоўскім. Ён зыходзіць з таго, што «культуралогія, калі яна, як і ўсякая навука, прэтэндуе на ролю тэарэтычнай, павінна перш за ўсё мець у сваёй аснове пэўны катэгарыяльны апарат, пабудаваны на пэўнай лагічнай аснове» [13, с. 14]. Для распрацоўкі сістэмы культуралагічных катэгорый М.І. Крукоўскі выкарыстоўваў логіку Гегеля ў спалучэнні са структурна-функцыянальным падыходам, прынятым у агульнай тэорыі сістэм, што вядзе да «падтрыманага аўтарытэтам матэматыкі аб'ектыўна навуковага падыходу» [14, с. 10].

Безумоўна, канцэптуальныя схемы гуманітарных навук адрозніваюцца ад тых, якія ўжываюцца ў прыродазнаўстве. І тут слушным з'яўляецца выкарыстанне метадаў іх размежавання, якія былі распрацаваныя ў філасофіі. Гэта, напрыклад, адрозненне «тлумачэння» і «разумення», прапанаванае Дыльтэем. Тым не менш, як адзначыў вядомы амерыканскі даследчык культуры К. Гірц, «няма ніякіх прычын для таго, каб канцэптуальныя схемы культурнай інтэрпрэтацыі менш паддаваліся фармулёўкам і дакладным крытэрыям ацэнкі, чым, напрыклад, схемы вопытаў у біялогіі або эксперыментаў у фізіцы» [15, с. 32].

У аснове навукі знаходзіцца арыентацыя на прадметнае і аб'ектыўнае даследаванне рэчаіснасці, выяўленне заканамернасцей яе развіцця. Прадмет – гэта той аспект рэчаіснасці, які вывучае дадзеная навука. Ён вылучаецца пры дапамозе канцэптуальных схем. Культуралогія накіравана на вывучэнне культуры як асобнай з'явы. Адзначым, што выкарыстанне канцэптульных схем у розных навуках вядзе не да спрашчэння рэчаіснасці, а да выяўлення яе структуры і заканамернасцей развіцця. Такім чынам, пры дапамозе паняцця «культура» мы выяўляем і пазначаем пэўную галіну рэчаіснасці. Трэба ўлічваць, што гэтае паняцце «з'яўляецца адным з самых шматзначных у сацыяльных і гуманітарных ведах. Аднак, нягледзячы на сваю шматзначнасць, яно прэтэндуе на ролю эфектыўнага канцэпта ў цэлым комплексе дысцыплін сучасных ведаў» [16, с. 35].

Шматзначнасць азначэнняў культуры абумоўлена, па-першае, яе складанасцю, і, па-другое, тым, што гэтае паняцце набывае новы змест у працэсе развіцця культуры і спосабаў яе асэнсавання. Адзначым, што самі спробы азначэння культуры з'яўляюцца фактарам яе развіцця. Сучасныя беларускія даследчыкі зыходзяць пераважна з дзейсных трактовак культуры. Так, акадэмік Я.М. Бабосаў абазначае культуру як «спецыфічна чалавечы спосаб дзейнасці, накіраваны на стварэнне духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей, вынікам якога з'яўляецца сістэма ідэалаў у дынамічным развіцці, каштоўнасцей, норм паводзін, якія ўвасабляюцца ў сацыяльным развіцці чалавека, у яго духоўным свеце» [17, с. 450]. Гэтаму адпавядае і азначэнне акадэміка В.С. Сцёпіна: «Культура – сістэма надбіялагічных праграм чалавечай дзейнасці, што гістарычна развіваюцца, паводзін і зносін, якія выступаюць умовай узнаўлення і змены сацыяльнага жыцця ва ўсіх яго асноўных праявах» [18, с. 524]. Такім чынам, культура разглядаецца як кампанент чалавечай жыццядзейнасці: «Культура выступае ў якасці асаблівай падсістэмы грамадскага жыцця, якая забяспечвае ўзнаўленне і развіццё чалавечай сацыяльнасці, нясе ў сабе нешта, што можа быць пазначана як "сацыякод". Па аналогіі з генетычным кодам культура забяспечвае захаванне і перадачу праграм чалавечых зносін, паводзін і дзейнасці» [19, с. 92]. Культурны код «уяўляе сабой адшліфаваную стагоддзямі гістарычнага развіцця народа сістэму ўнікальных архетыпаў, вобразаў і каштоўнасцей, якія характарызуюць яго ідэнтычнасць, менталітэт і духоўна-маральныя ўста-

ноўкі» [20, с. 48]. Трэба ўлічваць, што сёння, ва ўмовах трансфармацыі нашага грамадства адбываюцца істотныя змены ва ўсіх яго сферах, у тым ліку і ў культуры, «калі папярэдняя "катэгарыяльная мадэль свету", што гістарычна склалася і замацавалася традыцыяй, перастае забяспечваць трансляцыю новага вопыту, счапленне і ўзаемадзеянне неабходных грамадству відаў дзейнасці» [8, с. 277]. Тыя змены, якія цяпер адбываюцца, вядуць да пераасэнсавання ролі культуры ў грамадстве і на гэтай аснове – да іншага разумення яе сутнасці, структуры і механізмаў развіцця.

Марксізм, у межах якога вывучалася і трактавалася культура ў савецкім грамадстве, з'яўляецца адной з вялікіх сацыяльна-філасофскіх тэорый. Ён прапаноўваў стройную і ўсеабдымную карціну рэчаіснасці. Згодна з ім, у аснове грамадства знаходзіцца «базіс» – сукупнасць вытворчых узаемаадносін, а над ім узвышаецца «надбудова» – грамадская свядомасць. Менавіта да «грамадскай свядомасці» адносілася культура, а яе характар і развіццё вызначаліся «базісам».

Сёння даследчыкі імкнуцца растлумачыць спецыфіку таго ці іншага грамадства менавіта яго культурай: «Культура ў межах розных сацыяльных тэорый ператвараецца ў нейкую базавую інстанцыю, тлумачальны прынцып, парадыгму, да якой звяртаюцца для даследавання тых або іншых праблем сацыяльнага развіцця… У пэўным сэнсе слова «"культура"» ў сацыягуманітарных тэорыях выступае як аналаг Марксавага паняцця «"базіс"» [11, с. 15]. Такі падыход неаднаразова і абгрунтавана падвяргаўся крытыцы, бо ён непазбежна прыводзіць да прынцыпу «культура тлумачыць усё», які з'яўляецца памылковым. Састарэлай і не адпавядаючай складанасці сучасных сацыяльных працэсаў здаецца сама спроба знайсці нейкі фундамент і, абапіраючыся на яго, пабудаваць карціну грамадства ва ўсіх яго разнастайных і разнаякасных праявах. Больш адэкватным, на наш погляд, з'яўляецца сістэмны падыход, калі грамадства і культура разглядаюцца ва ўзаемадзеянні ўсіх іх кампанентаў, праз якое ўтвараецца якасна новая цэласнасць.

**Праблема структуры культуры**

У сучаснай беларускай культуралогіі захоўваецца традыцыйны падзел на матэрыяльную і духоўную культуру. Але ў адрозненне ад папярэдніх матэрыялістычных падыходаў лічыцца, што гэтыя кампаненты раўнапраўныя і знаходзяцца паміж сабой у стане дыялогу. Але большасць даследчыкаў зараз падкрэсліваюць перавагу духоўнай культуры: «Менавіта духоўная культура ўяўляе сабой галоўную частку цэласнай сістэмы культуры» [21, с. 293–294]. Гэта адпавядае сусветным тэндэнцыям узрастання ролі духоўнай культуры. У гэтай сувязі яна павінна быць праінтэрпрэтавана і пазначана яе функцыянальная роля ў грамадстве. У прыватнасці, неабходна даць навуковую інтэрпрэтацыю катэгорыі «духоўнасць» і яе анталагічнага статусу. Ці з'яўляецца яна характарыстыкай унутранага свету чалавека, ці мае надындывідуальную прыроду (сацыяльную альбо трансцэндэнтную)?

Таксама адной з тэм разважання для сучасных беларускіх даследчыкаў культуры можа стаць прапанаваная У.І. Крукоўскім трохчленная яе структура, у якой разам з духоўнай і матэрыяльнай культурай існуе яшчэ і мастацкая, якая «знаходзіцца як бы ў цэнтры культуры ў цэлым, уключаючы духоўны і матэрыяльны яе пласты» [22, с. 7].

Надзвычай важным для сучаснай беларускай культуралогіі ўяўляецца адказ на пытанне «Чым з'яўляецца гістарычны шлях чалавецтва – паслядоўным развіццём па нейкай абавязковай для ўсіх лінейнай схеме (стадыі, этапы) ці ўзаемадзеяннем розных тыпаў культур-цывілізацый?» [7, с. 85]. Ён вядзе да асэнсавання ролі культурнай спецыфікі ў развіцці грамадства. Падкрэслім, што гэта даволі складаная праблема, і існуюць розныя яе трактоўкі. Тым не менш вельмі прадуктыўным для развіцця нашай грамадскай свядомасці з'яўляецца вылучэнне і асэнсаванне спецыфічных рыс еўрапейскай культуры, у якасці асноўных з якіх Дэрыда і Хабермас назвалі наступныя: «хры-

сціянства і капіталізм, прыродазнаўчыя навукі і Кодэкс Напалеона, грамадзянска-гарадская форма жыцця, дэмакратыя і правы чалавека, секулярызацыя дзяржавы і грамадства» [23].

Выкарыстанне тэорыі лакальных тыпаў культур (ці цывілізацый) прыводзіць да асэнсавання нашай культурнай спецыфікі ў яе прасторавым вымярэнні. Але вельмі важна падкрэсліць, што сама актуальнасць гэтага выкарыстання абумоўлена тымі працэсамі, якія адбываюцца ў апошні час. У савецкім грамадстве лічылася, што ў краіне існуе адзіная культура, «сацыялістычная па змесце і нацыянальная па форме». Пасля распаду СССР выявілася істотная розніца паміж яго былымі рэспублікамі, і кожная з іх пайшла сваім шляхам развіцця, што абумоўлена спецыфікай у культуры.

**Заключэнне**

Такім чынам, мы разгледзелі праблемы, якія неабходна ўлічваць пры стварэнні тэорыі ў сучаснай беларускай культуралогіі. У заключэнне скажам аб важным аспекце праблемы практычнай значнасці культуралагічных даследаванняў ва ўмовах сучаснай Беларусі. Навуковая тэорыя павінна не толькі тлумачыць рэчаіснасць, але і выяўляць заканамернасці яе развіцця, мець прагнастычны характар.

Вельмі цяжка зараз будаваць прагнозы адносна далейшага развіцця беларускай культуры. Але найбольш верагодным уяўляецца, што, па-першае, яна будзе развівацца ў накірунку прыняцця норм і прынцыпаў еўрапейскай культуры і, па-другое, будзе ўзмацняцца наша культурная спецыфіка.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Смолік, А. І. Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 275 с.
2. Смолік, А. І. Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спецыяльнасці 1-21 04 01 «Культуралогія» / А. І. Смолік, Л. К. Кухто. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 235 с.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад рэд. М. Р. Суднік. – Мінск : Беларус. савец. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 1977–1984. – Т. 5, кн. 1 : С – У. – 1982. – 663 с.
4. Конан, У. М. Беларуская культура: нацыянальная самабытнасць і ўніверсальны кантэкст / У. М. Конан // Информационно-образовательные и воспитательные стратегии в современном обществе: национальный и глобальный контекст : материалы Междунар. науч. конф., Минск, 12–13 нояб. 2009 г. ; редкол.: Т. И. Адула [и др.]. – Минск : Право и экономика, 2010. – С. 704–706.
5. Багдановіч, М. Хто мы такія? / М. Багдановіч // Поўны збор твораў : у 3 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992–1995. – Т. 3. – 1995. – С. 126–127.
6. Никифоров, В. А. Наше будущее каждый миг превращается в наше прошлое / В. А. Никифоров // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2015. – № 2 (24). – С. 116–120.
7. Игнатович, П. Г. Культурный потенциал народа и формирование имиджа страны / П. Г. Игнатович // Культура. Наука. Творчество : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2013. – Вып. 7. – С. 491–495.
8. Смолик, А. И. Белорусская культурология как научная дисциплина: становление и развитие / А. И. Смолик // Искусство и культура. – 2011. – № 1. – С. 83–89.
9. Степин, В. С. Теоретическое знание / В. С. Степин. – М. : Прогресс-Традиция, 2000. – 744 с.
10. Грыгаровіч, Я. Д. Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с.

10. Дубянецкі, Э. С. Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. С. Дубянецкі. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2003. – 384 с.

11. Смолік, А. І. Беларуская культура ў кантэксце сучасных гуманітарных ведаў / А. І. Смолік // Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай беларускай культуры : матэрыялы навук. канф., Мінск, 23–24 лістап. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2013. – С. 12–18.

12. Швырев, В. С. Теория / В. С. Швырев // Новая философская энциклопедия : в 4 т. / науч. ред.: В. С. Степин [и др.]. – М. : Мысль, 2010. – Т. 4. – С. 42–45.

13. Крукоўскі, М. І. Тэарэтычная культуралогія: яе сутнасць і перспектывы / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2006. – № 6. – С. 10–18.

14. Крукоўскі, М. І. Тэарэтычная культуралогія: наколькі яна можа быць дакладнай навукай / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2008. – № 9. – С. 5–11.

15. Гирц, К. Интерпретация культур / К. Гирц. – М. : РОССПЭН, 2004. – 560 с.

16. Абушенко, В. Л. Культурсоциологический анализ: предметная рамка / В. Л. Абушенко // Социология. – 2015. – № 3. – С. 35–44.

17. Бабосов, Е. М. Философия науки и культуры / Е. М. Бабосов ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т социологии. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 581с.

18. Степин, В. С. Культура / В. С. Степин // Всемирная энциклопедия. Философия / гл. науч. ред. и сост. А. А. Грицанов. – М. : АСТ ; Минск : Харвест : Совет. литератор, 2001. – С. 524–526.

19. Игнатович, П. Г. Роль культурной политики в формировании международного имиджа Беларуси / П. Г. Игнатович // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2013 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – С. 92–98.

20. Бабосов, Е. М. Культурный код нации: сущность и особенности / Е. М. Бабосов // Наука и инновации. – 2016. – № 3. – С. 48–50.

21. Бабосов, Е. М. Человек в социальных системах / Е. М. Бабосов ; Ин-т социологии Нац. акад. наук Беларуси. – Минск : Белорус. наука, 2013. – 481 с.

22. Крукоўскі, М. І. Да праблемы матэматычнага мадэліравання асноўных катэгорый і паняццяў тэарэтычнай культуралогіі / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2012. – № 1 (17). – С. 5–16.

23. Деррида, Ж. Наше обновление после войны: второе рождение Европы [Электронный ресурс] / Ж. Деррида, Ю. Хабермас // Отечеств. зап. – 2003. – № 6 (14). – Режим доступа: http://www.strana-oz.ru/2003/6/nashe-obnovlenie-posle-voyny-vtoroe-rozhdenie-evropy2. – Дата доступа: 03.10.2017.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 20.10.2017

***Adzinochanka V.A.*** **Modern Belarusian Culturology: the Problem of Theory Construction**

*The problem of theory construction in modern Belarusian culturology is considered in the article. Conceptual schemes from which emanate the Belarusian researchers of culture are described. The need of understanding these schemes and discussion of the prospects of their development is also emphasized. It is noted that many theoretical approaches are applied in culturology, each of which exposes one of the aspects of culture. It is important to proceed from the nature of the processes that are currently taking place in the country in modern Belarusian culturology. Now you should go by the accumulation of empirical material on the history and current state of Belarusian culture to its theoretical understanding. Cultural studies in modern Belarus are practical. Through them comprehended the specifics of our culture and the direction of its development are determined.*